*Н. А. Лісоўская* (ДУА “Сярэдняя школа № 14 г. Мазыра”)

# ФАРМІРАВАННЕ Ў ВУЧНЯЎ УНІВЕРСАЛЬНЫХ ВУЧЭБНЫХ ДЗЕЯННЯЎ НА ЎРОКАХ “ЧАЛАВЕК І СВЕТ” ПРАЗ ВЫКАРЫСТАННЕ МЕТАДУ ІНТЭЛЕКТ-КАРТ

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца магчымасці эфектыўнага выкарыстання метаду інтэлект-карт на ўроках “Чалавек і свет” у пачатковай школе.

Для любога настаўніка вельмі важна, каб яго вучні любілі і ведалі прадмет. Кожны з нас імкнецца зрабіць свае ўрокі яркімі, эмацыянальнымі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.

і запамінальнымі.Адна з асноўных праблем, якія ўзнікаюць пры вывучэнні прадмета “Чалавек і свет” у пачатковай школе, на наш погляд, заключаецца ў тым, што навучэнцам прапануецца разгледзець і засвоіць дастаткова шырокі матэрыял, які змяшчае інфармацыю з самых розных абласцей ведаў. Адзін толькі раздзел, прысвечаны жывой прыродзе, мае на мэце знаёмства з такімі біялагічнымі навукамі, як анатомія і фізіялогія раслін (тэма “Будова раслін”), сістэматыкай раслін (тэма “Разнастайнасць раслін”), анатоміяй і фізіялогіяй жывёл і іх сістэматыкай, мікалогіяй (тэма “Грыбы”).Акрамя таго, праграма па прадмеце “Чалавек і свет” у 4 класе змяшчае гістарычны матэрыял, які выкладаецца на беларускай мове.Такі аб’ём інфармацыі складана засвоіць без належнай сістэматызацыі.Сучасныя адукацыйныя стандарты патрабуюць укаранення новых педагагічных тэхналогій, заснаваных на ўспрыманні вялікага аб’ёму вучэбнай інфармацыі, прадстаўленай у сімвалічнай (графічнай) форме.

У фарміраванні ўніверсальных навучальных дзеянняў на ўроках “Чалавек і свет” нам дапамагае тэхналогія ментальных карт, або інтэлект-карт. Ментальная карта – карта памяці, розуму, інтэлект-карта – комплекснае, графічнае, сістэматызаванае адлюстраванне сэнсавых, асацыятыўных, прычынна-выніковых сувязей паміж прыроднымі аб’ектамі і з’явамі на вялікім аркушы паперы. Ментальная карта як элемент тэхналогіі візуалізацыі прадугледжвае згортванне інфармацыі ў пачатковы вобраз.Назва дадзенага метаду звязана з імем Тоні Б’юзена, вядомага пісьменніка, лектара і кансультанта, які ў свой час стараўся адказаць на пытанне: “Як навучыцьвучыцца?” [1].

Інтэлект-карта – гэта графічны вобраз працэсу мыслення.Яна характарызуецца трыма асноўнымі ўласцівасцямі: нагляднасць, прывабнасць, запамінальнасць. Большую частку інфармацыі пра свет навучэнцы пачатковай школы ўспрымаюць візуальна, і таму інтэлект-карта – гэта добры наглядны матэрыял, які прасцей запомніць і з якім прасцей працаваць.Акрамя таго, на думку Б’юзена, на аснове дадзенага метаду можна стварыць сістэму навучання, якая ўзброіць навучэнца самым важным уменнем – уменнем самастойна набываць веды і выкарыстоўваць іх у сваёй дзейнасці.

Вопыт нашай працы паказвае, што выкарыстанне інтэлект-карты дае цэласную карціну вывучаемага прадмета, прыцягвае ўвагу дзяцей, дазваляе вучням хутчэй уносіць карэктывы ў сваю працу, паляпшае памяць, развівае творчае мысленне, здымае стрэс, дазваляе павялічыць аб’ём і эфектыўнасць засваення матэрыялу.Строгіх правілаў складання карты памяці няма, як няма і няправільных карт: выпрацоўваючы свой стыль, складальнік можа мяняць усё. Галоўнае, каб мысленне вылучалася прадуктыўнасцю – для гэтага і былі прыдуманы інтэлект-карты. Складанне карт пачынаем з цэнтра



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чыстага аркуша, куды змяшчаем галоўную ідэю (або тэму), заключаем яе ў ромб, круг ці іншую фігуру, якая прыцягвае ўвагу. Ад цэнтра разыходзяцца адгалінаванні, адпаведныя ключавым момантам або раздзелам.На галінах запісваецца ключавое слова або фраза і пакідаецца месца для дапаўнення карты дэталяміў працэсе далейшай працы. Для лепшага запамінання настаўнік можа выкарыстоўваць умоўныя знакі, сімвалы і малюнкі.

Вывучэнне, засваенне, абдумванне тэксту – гэта і ёсць складанне схем у розуме, крыніца матэрыялу. Пры неабходнасці вучань можа аднавіць, “разгарнуць”увесь тэкст, якасць якога залежыць ад якасці складзеных у памяці схем. Гэта складаная інтэлектуальная праца, таму вучняў трэба паслядоўна да яе рыхтаваць.Пры выкарыстанні ментальных карт на ўроку мэтазгодна кіравацца наступнымі правіламі:

• ахоп з дапамогай інтэлект-карты ўсяго навучальнага матэрыялу, які адносіцца да дадзенай тэмы;

• структурна-сэнсавае адзінства матэрыялу, які вывучаецца на ўроку і які выносіцца на самастойнае вывучэнне;

• паслядоўнае разгортванне асноўнай ментальнай карты;

• аптымізацыя памераў і колькасці намаляваных на карце элементаў і сувязей у адпаведнасці з магчымасцю іх успрымання і засваення;

• дэталізацыя галін ментальнай карты з дапамогай дадатковых малюнкаў.

Важнай умовай выкарыстання ментальных карт з’яўляецца пастаяннае ўключэнне іх у працу. Інтэлектуальнае развіццё дзіцяці з ужываннем карт ажыццяўляецца праз папаўненне і актывізацыю слоўнікавага запасу, развіццёмаўлення, фантазіі, асацыятыўнага мыслення. Дзіця, працуючы з інтэлектуальнымі картамі, ідзе ў сваім развіцці ад простых лагічных аперацый – параўнанне, супастаўленне прадметаў, размяшчэнне ў прасторы – да ўмення аналізаваць, дыферэнцаваць, рабіць класіфікацыю прадметаў, вучыцца адрозніваць. Развіваюцца камунікатыўныя ўласцівасці, уменне слухаць настаўніка, таварыша па групе, фарміруецца жаданне быць актыўным, праяўляць ініцыятыву, выхоўваюцца лідарскія якасці і разам з тым павага да іншых. Калектыўная праца з інтэлектуальнымі картамі спрыяе фарміраванню матывацыі да навучання, эмацыйна валявой сферы, уменне працаваць у калектыве.

Карту можна скласці як уручную, так і з дапамогай камп’ютарных праграм, сярод вялікай колькасці якіх вы можаце знайсці бясплатную версію. З дапамогай адмысловай праграмы XMind 7 намі распрацаваны ментальныя карты па ўсіх тэмах прадмета “Мая Радзіма – Беларусь” для 4 класа. Атрымаліся маляўнічыя карты, якія можна выкарыстоўваць пры вывучэнні розных тэм па прадмеце “Чалавек і свет”, захоўваць, раздрукоўваць для ўрокаў ці ўстаўляць у прэзентацыю.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Якія ж асаблівасці працы з ментальнымі картамі ў пачатковай школе?На першым этапе звяртаемся да ментальнай карты як да дэманстрацыйнай, апорнай табліцы, размяшчаючы яе на дошцы.Ужо ў канцы першага года навучання вучні спрабуюць скласці карты па ўзоры і пад кіраўніцтвам настаўніка.Наступны этап заключаецца ў абмеркаванні з дзецьмі, што яны лічаць важным, неабходным для размяшчэння на карце па вывучаемай тэме, знаходжанні ключавых слоў.І, нарэшце, вучні самі ствараюць ментальныя карты.Адбываецца самастойнае канструяванне ведаў, вынікам якога выступае дзейнасны адукацыйны прадукт.Навучэнцы становяцца актыўнымі ўдзельнікамі вучэбнага працэсу.

Ментальныя карты можна выкарыстоўваць на этапе вывучэння новай тэмы, на этапе замацавання ведаў, праверкі дамашняга задання. З ментальнымі картамі на ўроках “Чалавек і свет” вучні выконваюць розныя дзеянні: тлумачаць матэрыял па сваёй карце памяці, запаўняюць, размалёўваюць карты, знаходзяць памылкі ў “дэфармаваных” картах, самастойнае складаюць і абараняюць сваекарты. Ментальныя карты дазваляюць навучэнцам малодшых класаў успомніць і паўтарыць матэрыял, глыбей разабрацца ў вывучаемым матэрыяле, прывесці ў сістэму набытыя веды. Настаўніку ментальная карта дазваляе нагляднa адлюстраваць увесь матэрыял, сканцэнтраваць увагу навучэнцаў на асобных, найбольш цяжкіх пытаннях, хутка, без вялікіх часавых затрат праверыць, як вучань зразумеў і запомніў вывучаны матэрыял.

## Літаратура


1. *Васильева, И. Н.* Картирование мышления : быть или не быть интеллект-картам в начальных классах? / И. Н. Васильева, О. Г. Сорока. – Пачатковае навучанне : сям’я, дзіцячы сад, школа. – 2016. – № 4. – С. 1–16. – (Прил. к журналу “Университет педагогического самообразования”).


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова